## САМУСІК ІВАН МІХАЙЛАВІЧ



**Месца нараджэння:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата нараджэння:** 1924

**Дата смерці:** лістапад 1943

**Месца подзвігу:** Аршанскі раён, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1943

**Ушанаванне:** Віцебская вобл., г. Орша – вуліца, помнік

Адзін з актыўных удзельнікаў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Са жніўня 1941 года – у складзе падпольнай групы В. Прыгоды. Падпольшчыкі збіралі зброю, боепрыпасы, узрывалі варожыя саставы з гаручым. Члены групы збіралі разведданыя аб праціўніку, вялі антыфашысцкую прапаганду, аказвалі дапамогу савецкім ваеннапалонным. У 1943 годзе група падпольшчыкаў увайшла ў склад партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава. Кулямётчык І. М. Самусік загінуў, калі прыкрываў адыход партызан. Пахаваны ў в. Бабрамынічы Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

Імем І. М. Самусіка названа вуліца ў г. Орша Віцебскай вобласці, на помніку побач з аршанскай СШ № 14 выбіта яго імя.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Самусик** Иван Михайлович // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 532.
2. **У адным** страі з бацькам // Ленінскі прызыў (Орша). – 1976. – 13 ліп. – С. 2.
3. **Шайдаў, У.** Сэрца партызана / У. Шайдаў // Маладосць. – 1971. – № 4. – С. 94–96.

**Самусик** Иван Михайлович // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 532.

**САМУСИК ИВАН МИХАЙЛОВИЧ (1924 г. – ноябрь 1943 г.)**

Участник Оршанского коммунистического подполья и партизанского движения на территории Витебской области в годы Великой Отечественной войны.

Родился в г. Орша. Член ВЛКСМ. С августа 1941 в составе подпольной группы В. Т. Пригоды. Подпольщики собирали и передавали партизанам оружие, боеприпасы, взорвали вражеский состав с бензином, в результате чего пожаром уничтожено большое количество техники противника, осуществляли другие диверсии, вели пропагандистскую работу среди личного состава власовских формирований, оказывали помощь военнопленным, направляли патриотов в партизанские отряды. При угрозе ареста группа в сентябре 1943 влилась в партизанский отряд бригады им. К. С. Заслонова. Пулеметчик И. М. Самусик погиб, прикрывая отход партизан. Похоронен в д. Бобромыничи Оршанского района, на могиле установлен обелиск.

Именем И. М. Самусика названа улица в г. Орша; на памятнике возле школы № 14, где он учился, выбито его имя.

**У адным** страі з бацькам // Ленінскі прызыў (Орша). – 1976. – 13 ліп. – С. 2.

## У АДНЫМ СТРАІ З БАЦЬКАМ

Звычайны хлопец Іван Самусік вырас у ціхім дэпоўскім пасёлку. Нічым не адрозніваўся ад равеснікаў, хіба што сціпласцю і сумленнасцю.

Але, калі грымнулі першыя стрэлы Вялікай Айчыннай вайны, ён, сямнаццацігадовы юнак, не раздумваючы стаў у рады абаронцаў сваёй Радзімы. Іван Самусік знайшоў сваё месца ў саставе падпольнай камсамольскай групы В. Прыгоды. Пачаліся дні беспакойнага, небяспечнага жыцця.

Разам са сваімі сябрамі ён праводзіць дыверсіі на чыгуначным вузле, распаўсюджвае лістоўкі. Не раз даводзілася рызыкаваць жыццём, але сэрца поўнілася радасцю пасля кожнай паспяхова праведзенай аперацыі. Ды вораг таксама не драмаў. За групай было ўстаноўлена назіранне. Павісла пагроза арыштаў. Кіраўнік групы дае ўказанне таварышам ісці ў партызаны, у тым ліку і Івану Міхайлавічу Самусіку.

Пачалася новая барацьба, цяпер ужо са зброяй у руках. Дзёрзкія і смелыя аперацыі, ў якіх давялося прыняць удзел Самусіку, наносілі ворагу немалы ўрон. Нарэшце Івана прызначаюць камандзірам групы маладых байцоў атрада.

...Ішоў 1943 год. Набліжалася свята Кастрычніцкай рэвалюцыі. Кожная дыверсійная група рыхтавалася сустрэць яго новымі баявымі поспехамі. Група Івана Самусіка таксама рыхтавала свае падарункі Радзіме. Тры аўтамашыны з нямецкімі салдатамі ўзляцелі ў паветра. Наступнай ноччу група зноў выйшла на аперацыю. Але на гэты раз не пашанцавала: папалі ў засаду. Завязаўся няроўны бой. Трэба было адыходзіць. Іван застаецца прыкрыць сваіх таварышаў, а потым і сам адыходзіць услед за імі. Здавалася, небяспека мінула. Група ўвайшла ў невялікае сяло, заняла пуставаўшы дом. Але не паспелі размясціцца, як у сяло ўварваліся фашысты. І зноў пачаўся бой. Іван Самусік лёг за кулямёт. Загарэўся дах дома. У гэты час Самусік атрымаў першае раненне. Тут жа аддае загад усім адыходзіць, а сам зноў адкрывае агонь з кулямёта. Калі ўбачыў, што яго таварышы адышлі, пачаў кідаць у фашыстаў гранаты. Варожая куля зноў параніла. Але ён працягваў няроўны бой. І раптам абваліўся дах дома…

Так скончылася кароткае, але цудоўнае жыццё палымянага патрыёта сваёй Радзімы, партызана Івана Самусіка. Дорага адпомсцілі партызаны за смерць свайго баявога сябра.

Прайшлі гады. Але ніколі не памеркне ў памяці народнай слава яго лепшых сыноў. Не забылі і аршанцы імя юнага патрыёта Івана Самусіка.

Вуліца Лясная, дзе жыў герой, перайменавана ў вуліцу І. М. Самусіка. Памятаюць аб ім і ў аршанскай школе № 14, дзе калісьці ён вучыўся. Яго партрэт і расказ пра юнага героя можна ўбачыць у школьным музеі.